# Перагледжаная Еўрапейская хартыя аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці




Кангрэс мясцовых і рэгіянальных прадстаўнікоў улады
Савета Еўропы

The Congress
Le Congrès
COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

# Перагледжаная Еўрапейская хартыя аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці

Cover: SPDP, Council of Europe
Layout: Congress of Local and Regional Authorities
Photo: Council of Europe

Council of Europe, July 2015
Printed at the Council of Europe

**Уводзіны** ........................................................ **5**

**Перагледжаная Еўрапейская хартыя аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці** ........ ........................................................ **9**

# Уводзіны

«Актыўны ўдзел моладзі ў прыняцці рашэнняў і дзейнасці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях мае важнае значэнне, калі мы хочам пабудаваць больш дэмакратычнае, салідарнае і квітнеючае грамадства. Удзел у дэмакратычным жыцці любой супольнасці не зводзіцца да галасавання або высоўвання кандыдатаў на выбарах, хоць і гэта вельмі важна. Удзел і актыўная грамадзянская пазіцыя прадугледжваюць наяўнасць правоў, сродкаў, прасторы і магчымасцяў, а дзе неабходна – падтрымку, каб прымаць удзел і ўплываць на рашэнні, а таксама ўдзельнічаць у акцыях і мерапрыемствах з тым, каб спрыяць пабудове лепшага грамадства».

*Прэамбула перагледжанай Еўрапейскай хартыі аб удзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях.*

Прэамбула перагледжанай Еўрапейскай хартыі аб удзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях тлумачыць, што эфектыўны ўдзел моладзі мае важнае значэнне для здаровага, дэмакратычнага грамадства. Гэта асабліва актуальна, улічваючы кантэкст зніжэння ўдзелу маладых людзей у традыцыйных палітычных працэсах, якое назіралася ў апошнія гады. Толькі тады, калі дзяржаўная палітыка – ці то на нацыянальным, рэгіянальным або мясцовым узроўні – будзе адлюстроўваць рэаліі маладых людзей, будзе адроджана цікавасць моладзі да палітыкі.

Ужо ў 1992 годзе Пастаянная канферэнцыя мясцовых і рэгіянальных уладаў Савета Еўропы, папярэднік Кангрэса

мясцовых і рэгіянальных органаў улады, зразумела, што ўдзел моладзі патрабуе прыхільнасці з боку мясцовых і рэгіянальных органаў улады да фарміравання культуры, у яку маладыя людзі маюць магчымасць уносіць свой уклад цэннымііі і значнымі спосабамі. Прыхільнасць Пастаяннай канферэнцыі была перакладзеная Еўрапейскую хартыю аб удзеле моладзі ў муніцыпальным і рэгіянальным жыцці, якая стала вынікам дыскусій паміж моладдзю і мясцовымі і рэгіянальнымі выбарнымі прадстаўнікамі.

Хартыя была перагледжана ў 2003 годзе па просьбе маладых удзельнікаў на канферэнцыі па тэме «Моладзь – рухаючая сіла ў гарадах і рэгіёнах», арганізаванай Кангрэсам у Кракаве (Польшча) у сакавіку 2002 г. для святкавання 10-й гадавіны Хартыі.

Легітымнасць дэмакратычных інстытутаў можа быць пастаўлена пад сумнеў з-за адлегласці паміж месцамі, дзе прымаюцца рашэнні, і людзьмі, на якіх гэтыя рашэнні ўплываюць. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады маюць перавагу ў тым, што яны знаходзяцца да грамадзян бліжэй з усіх органаў, і, такім чынам, пачынаючы сапраўдны дыялог і усталёўваючы партнёрскія адносіны з людзьмі, якія жывуць на іх тэрыторыі, іх палітыка можа стаць па-сапраўднаму дэмакратычнай , актуальнай і эфектыўнай, паколькі яна заснавана на патрэбах грамадзян. Маладыя людзі з'яўляюцца грамадзянамі гарадоў і рэгіёнаў, у якіх яны жывуць, і калі культура ўдзелу моладзі й павінна быць развіта, то яна можа ўкараніцца і вырасці менавіта на гэтых узроўнях.

Маладыя людзі маюць права ўдзельнічаць у дэмакратычных структурах і працэсах нашых грамадств. Яны маюць права быць пачутымі і прымаць свае ўласныя рашэнні па пытаннях, якія будуць уплываць на іх і іхняе жыццё. Аднак для гэтага неабходна, каб маладыя людзі разглядаліся не ў якасці ахвяр ці

як ўразлівая група, якая мае патрэбу ў абароне, і не ў якасці аб'ектаў умяшання дарослых, якія мяркуюць, што яны ведаюць, як лепш для маладых людзей. Гэты падыход, ухвалены ў перагледжанай Хартыі, дэкларуе адэкватную падтрымку і прыхільнасць да ўкаранення палітыкі і практыкі ўдзелу моладзі. Толькі ў гэтым выпадку органы ўлады змогуць пазбегнуць рызыкі прыцягнення маладых людзей выключна сімвалічнымі спосабамі.

Перагледжаная Хартыя дзеліцца на 3 часткі: сектаральная палітыка,дакументы для ўдзелу моладзі і інстытуцыйныя формы ўдзелу моладзі ў мясцовых і рэгіянальных справах.

**У частцы I** перагледжанай Хартыі змешчаны агляд розных галінаў палітыкі, такіх як ахова здароўя, гарадское асяроддзе, адукацыя і г.д., а таксама прапануецца шэраг канкрэтных мер, якія могуць забяспечыць неабходную падтрымку для ўдзелу маладых людзей у сваіх супольнасцях.

**У частцы II** разглядаюцца ідэі і інструменты, якія могуць быць выкарыстаныя мясцовымі і рэгіянальнымі органамі ўлады з мэтай пашырэння ўдзелу моладзі, такія як навучанне, інфармацыйныя паслугі, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, арганізацыі і г.д.

**У частцы III** ўвага канцэнтруецца на інстытуцыйным ўдзеле, структурах і падтрымцы, якія павінны быць заснаваныя з мэтай залучэння моладзі да працэсаў, у якіх яны могуць вызначаць свае патрэбы, распрацоўваць ідэі, прымаць рашэнні, якія закранаюць іх, і пры магчымасці – планаваць дзеянні з мясцовымі і рэгіянальнымі органамі ўлады на роўных умовах. Гэтыя структуры могуць ўключаць моладзевыя саветы, моладзевыя парламенты або моладзевыя форумы, якія, напрыклад, павінны быць пастаяннымі структурамі, якія складаюцца з выбарных або прызначаных прадстаўнікоў, і

павінны даваць маладым людзям прамую адказнасць за праекты і ўплыў на палітыку і г.д.

Удзел моладзі прымае шмат розных формаў: ад добраахвотнай працы да актыўнага удзелу ў арганізацыях, ад удзелу ў нефармальнай адукацыі да агітацыі. Перагледжаная Хартыя Кангрэса спецыяльна накіравана на садзейнічанне ўдзелу моладзі на мясцовым і рэгіянальным узроўнях, падаючы канкрэтныя ідэі і інструменты. Яна не з'яўляецца наборам правіл, якія павінны выконвацца паступова, з мэтай дамагчыся эфектыўнага ўдзелу моладзі, паколькі сітуацыі адрозніваюцца ў розных краінах і ў розных супольнасцях. Таму перагледжаная Хартыя павінна разглядацца як набор прынцыпаў, перадавой практыкі і кіруючых установак для павышэння ўдзелу моладзі на мясцовым і рэгіянальным узроўнях. Хоць перагледжаная Хартыя і не з'яўляецца юрыдычна абавязковым дакументам, Камітэт Міністраў Савета Еўропы прыняў рэкамендацыю ў падтрымку яе рэалізацыі, а гэта значыць, што дзяржавы-члены нясуць маральную адказнасць за яе рэалізацыю, нават калі яны юрыдычна не абавязаны гэтага рабіць.

Сістэма сумеснага кіравання, якая выкарыстоўваецца ў моладзевым сектары Савета Еўропы, дзе маладыя людзі і прадстаўнікі ўрада засядаюць за адным сталом для прыняцця сумесных рашэнняў, заснаваных на рэаліях маладых людзей, з'яўляецца мадэллю ўдзелу, якая павінна наследавацца ва ўсіх мясцовых і рэгіянальных саветах. Перагледжаная Еўрапейская хартыя аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці з'яўляецца інструментам, які спрыяе сумеснаму кіраванню, і пры шырокім выкарыстанні ў Еўропе дазволіць маладым людзям ўнесці свой уклад у будаўніцтва інклюзіўнага і квітнеючага грамадства, рэалізаваць свае правы на дэмакратычную грамадзянскасць і цалкам рэалізаваць свой патэнцыял ў якасці актыўных грамадзян.

# Перагледжаная Еўрапейская хартыя аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці

## Устав без статусу канвенцыі

*ухвалена Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных органаў улады Еўропы (10-е пасяджэнне - 21 мая 2003 - Дадатак да Рэкамендацыі 128)*

## Уступ

Аснова таго, што павінна было стаць перагледжанай Еўрапейскай хартыяй аб удзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях, была закладзена на першай і другой канферэнцыях па маладзёжнай палітыцы, арганізаваных Пастаяннай канферэнцыяй мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы, якія праводзіліся ў Лазане (чэрвень 1988 г.) і ў Лланголлен (верасень 1991 г.) адпаведна. Неўзабаве пасля гэтага, у сакавіку 1992 года, Пастаянная канферэнцыя прыняла Рэзалюцыю 237 і яе артыкул 22, у якім гаворыцца аб прыняцці Хартыі.

У рамках святкавання 10-годдзя Еўрапейскай хартыі аб удзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях Савет Кангрэса Еўропы мясцовых і рэгіянальных органаў улады Еўропы у партнёрстве з Дырэкцыяй па справах моладзі і спорту Савета Еўропы арганізаваў канферэнцыю пад назвай «Моладзь – рухаючая сіла ў сваіх гарадах і рэгіёнах». Агульнай мэтай канферэнцыі, якая адбылася ў Кракаве 7 і 8 сакавіка 2002 года, была ацэнка поспехаў, дасягнутых ў галіне ўдзелу моладзі за час дзесяцігадовага існавання Хартыі, а таксама абмеркаванне магчымасці далейшага пашырэння ўдзелу моладзі, менавіта дзякуючы распаўсюджванню перадавога вопыту. Удзельнікі канферэнцыі прынялі Кракаўскую дэкларацыю, у якой яны пацвердзілі, што маладыя людзі

з'яўляюцца грамадзянамі муніцыпалітэтаў і рэгіёнаў, у якіх яны жывуць, таксама як і любая іншая ўзроставая група, і такім чынам павінны мець доступ да ўсіх формаў удзелу ў жыцці грамадства, а таксама пацвердзілі і павысілі ролю моладзі ў развіцці дэмакратычнага грамадства, у мясцовым і рэгіянальным грамадскім жыцці. Апроч таго, Канферэнцыя стала ўкладам у Інтэграваны праект Савета Еўропы «Дэмакратычныя інстытуты ў дзеянні».

Разам з тым удзельнікі прапанавалі адказаць на новыя выклікі, якія стаяць перад моладдзю ў сучасным грамадстве. Так, яны папрасілі Кангрэс мясцовых і рэгіянальных органаў улады Еўропы і Кансультатыўны савет па пытаннях моладзі Савета Еўропы прызначыць экспертаў для падрыхтоўкі прапаноў пра ўнясенне паправак да Еўрапейскай хартыі аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці, каб яна рэагавала на новыя выклікі XXI стагоддзя, такія як інфармацыйнае грамадства і адсутнасць бяспекі ў гарадах.

Рабочыя нарады былі скліканыя ў канцы 2002 года і на пачатку 2003 года. Абмеркаванні на рабочых пасяджэннях паклалі аснову цяперашняй версіі Хартыі. Гэтая версія Хартыі складаецца з трох раздзелаў. Першы дае мясцовым і рэгіянальным органам улады кіруючыя ўстаноўкі для ажыццяўлення палітыкі, уплывае на моладзь у цэлым шэрагу галінаў. Другая частка змяшчае ўсе неабходныя інструменты для пашырэння ўдзелу маладых людзей. Нарэшце, у трэцім раздзеле змяшчаюцца рэкамендацыі адносна таго, як забяспечыць інстытуцыйныя ўмовы для ўдзелу маладых людзей.

## Прэамбула

Актыўны ўдзел моладзі ў прыняцці рашэнняў і дзейнасці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях мае важнае значэнне, калі мы хочам пабудаваць больш дэмакратычнае, салідарнае і

квітнеючае грамадства. Удзел у дэмакратычным жыцці любой супольнасці не зводзіцца да галасавання або высоўвання кандыдатаў на выбарах, хоць і гэта вельмі важна. Удзел і актыўная грамадзянская пазіцыя прадуглежваюць наяўнасць правоў, сродкаў, прасторы і магчымасцяў, а дзе неабходна – падтрымку для ўдзелу і ўплыву на рашэнні і ўдзелу ў акцыях і мерапрыемствах з тым, каб спрыяць пабудове лепшага грамадства.

Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады, якія з'яўляюцца бліжэйшымі да моладзі, маюць вялікае значэнне ў садзейнічанні ўдзелу моладзі. Пры гэтым, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады могуць спрыяць, каб маладыя людзі не толькі мелі магчымасць пазнаёміцца з прынцыпамі дэмакратыі і грамадзянства, але й мелі магчымасць практыкаваць іх. Тым не менш, удзел моладзі ў жыцці грамадства не абмяжоўваецца толькі фарміраваннем актыўных грамадзян і пабудовай дэмакратыі ў будучыні. Вельмі важна, каб удзел значыў для маладых людзей тое, што яны могуць уплываць і фармаваць рашэнні і дзеянні, менавіта калі яны маладыя, а не толькі на пазнейшым этапе жыцця.

Калі мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады падтрымліваюць і заахвочваюць ўдзел моладзі, яны таксама спрыяюць яе сацыяльнай інтэграцыі, дапамагаючы ёй не толькі адолець праблемы і цяжкасцы, але і прыняць выклікі сучаснага грамадства, у якім ананімнасць і індывідуалізм часта з'яўляюцца пераважнымі. Тым не менш, для паспяховага, стабільнага і асэнсаванага ўдзелу моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці неабходна больш, чым развіццё або рэарганізацыя палітычных ці адміністратыўных сістэм. Любая палітыка і меры, закліканыя актывізаваць удзел моладзі, павінны забяспечваць, каб культурнае асяроддзе паважала маладых людзей, а таксама ўлічваць розныя патрэбы, абставіны і чаканні маладых людзей. Таксама яны абавязкова павінны ўключаць элементы забавы і задавальнення.

## Прынцыпы

1. Удзел моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці павінен стаць часткай агульнай палітыкі па залучэнню грамадзян да грамадскага жыцця, выкладзенай у Рэкамендацыі Rec (2001) 19 Камітэту міністраў дзяржавам-сябрам аб удзеле грамадзян у мясцовым грамадскім жыцці.

2. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады перакананыя, што ўсе галіновыя стратэгіі павінны быць моладзевымі. Таму яны абавязваюцца выконваць палажэнні Хартыі і ўкараняць розныя формы ўдзелу, якія будуць вызначацца па ўзгадненні і сумесна з моладдзю і яе прадстаўнікамі.

3. Прынцыпы і розныя формы ўдзелу, апісаныя ў гэтай Хартыі, распаўсюджваюцца на ўсіх маладых людзей без дыскрымінацыі. Для таго каб дасягнуць гэтага, асаблівая ўвага павінна надавацца стымуляванню ўдзелу ў мясцовым і рэгіянальным жыцці маладых людзей з непаспяховых слаёў грамадства і з этнічных, нацыянальных, сацыяльных, сэксуальных, культурных, рэлігійных і моўных меншасцяў.

# Частка I. Галіновая палітыка

## I.1. Палітыка па пытаннях спорту, адпачынку і асацыятыўнага жыцця

4. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны падтрымліваць сацыяльна-культурныя мерапрыемствы, якія праводзяцца моладзевымі аб'яднаннямі і арганізацыямі, моладзевымі групамі і грамадскімі цэнтрамі, якія, разам з сям'ёй і школай, працай, з'яўляюцца адным са слупоў сацыяльнага адзінства ў горадзе ці рэгіёне; яны з'яўляюцца ідэальным каналам ўдзелу моладзі і рэалізацыі моладзевай палітыкі ў галіне спорту, культуры, рамёстваў і промыслаў, мастацкіх і іншых формаў творчасці і выразу, а таксама ў галіне сацыяльнай дзейнасці.

5. З мэтай развіцця мясцовых і рэгіянальных моладзевых аб'яднанняў, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны, выкарыстоўваючы адпаведныя меры, аказваць падтрымку, асабліва тым арганізацыям, якія рыхтуюць работнікаў і кіраўнікоў моладзевых клубаў і арганізацый, а таксама моладзевым работнікам, якія граюць важную ролю ў жыцці грамадства на мясцовым і рэгіянальным узроўнях.

6. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны заклікаць грамадскія аб'яднанні актыўна спрыяць залучэнню моладзі да дзейнасці іх статутных органаў.

## I.2. Палітыка па садзейнічанню занятасці моладзі і барацьбе з беспрацоўем

7. Эканамічныя і сацыяльныя ўмовы, з якімі сутыкаюцца маладыя людзі, уплываюць на іх гатоўнасць і здольнасць удзельнічаць у жыцці сваёй супольнасці. Калі маладыя людзі не маюць працы ці жывуць у галечы, у іх наўрад ці будуць жаданне, рэсурсы і сацыяльная падтрымка, каб быць актыўнымі грамадзянамі ў

мясцовым і рэгіянальным жыцці. Маладыя людзі, якія з'яўляюцца беспрацоўнымі, верагодна, будуць аднымі з самых абяздоленых ў грамадстве, і таму мясцовым і рэгіянальным органам улады варта распрацоўваць стратэгіі і ініцыятывы, накіраваныя на зніжэнне беспрацоўя сярод моладзі.

8. Такім чынам, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны:

i. распрацоўваць палітыку і праграмы сумесна з прадстаўнікамі моладзі (у тым ліку тых, якія не маюць працы ці могуць яе страціць), мясцовымі працадаўцамі, прафсаюзамі, органамі адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі і занятасці, а таксама моладзевымі арганізацыямі з мэтай ліквідацыі прычын беспрацоўя сярод моладзі і павелічэння магчымасцяў працаўладкавання для моладзі;

ii. ствараць мясцовыя цэнтры занятасці для аказання спецыялізаванай дапамогі і падтрымкі маладым беспрацоўным людзям у пошуку цікавай і стабільнай працы. Беспрацоўная моладзь павінна мець права ўдзельнічаць у кіраванні гэтымі цэнтрамі, калі яна таго пажадае;

iii. падтрымліваць стварэнне кампаній, прадпрыемстваў і кааператываў маладымі людзьмі ці групамі маладых людзей праз прадастаўленне фінансавай і іншай падтрымкі: памяшканняў, абсталявання, навучання і прафесійнай дапамогі;

iv. заахвочваць моладзь да эксперыментаў з сацыяльнай эканомікай, ініцыятывамі з самадапамогай або кааператывамі.

## I.3. Гарадское асяроддзе і жыллёвыя ўмовы, жыллёвая палітыка і транспарт

9. Сумесна з прадстаўнікамі моладзевых арганізацый, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны ствараць умовы для развіцця гарадской экалагічнай палітыкі на аснове больш комплекснага, менш раздробненага асяроддзя пражывання, спрыяльнага для сацыяльнага ўзаемадзеяння і развіцця высакаякасных грамадскіх месцаў.

10. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны праводзіць палітыку жыллёвага і гарадскога асяроддзя, актыўна прыцягваючы моладзь да кансультацыі, аб'ядноўваючы мясцовых або рэгіянальных выбарных прадстаўнікоў, кіраўнікоў эканамічных структур, лідэраў грамадскіх аб'яднанняў і архітэктараў. Іх мэтай з'яўляецца:

i. распрацаваць праграмы фарміравання больш гарманічнага асяроддзя, якое спрыяе самавыяўленню асобы і ўмацаванню рэальнай салідарнасці паміж пакаленнямі;
ii. распрацаваць узгодненую палітыку развіцця гарадскога асяроддзя, якая ўлічвала б сацыяльныя і культурныя структуры насельніцтва ў складанні праграм жыллёвага будаўніцтва і/або рэканструкцыі жылля.

11. У цесным супрацоўніцтве з моладзевымі арганізацыямі, аб'яднаннямі кватэранаймальнікаў і/або арганізацыямі спажыўцоў, установамі сацыяльнага жылля і сацыяльнымі работнікамі мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны спрыяць стварэнню або развіццю ў рамках існуючых сацыяльных структур:

i. мясцовых інфармацыйных службаў пошуку жылля для маладых людзей;

ii. мясцовых механізмаў (напрыклад, танных крэдытаў, сістэм гарантавання арэнднай платы) для дапамогі маладым людзям у атрыманні доступу да жылля.

12. Мабільнасць маладых людзей магчымая за кошт лёгкага доступу да грамадскага транспарту, асноўнымі карыстальнікамі якога яны з'яўляюцца. Такая мабільнасць цалкам неабходна для ўдзелу ў грамадскім жыцці і адчуванні сябе паўнавартаснымі грамадзянамі.

13. Таму моладзь павінна прымаць удзел у арганізацыі грамадскага транспарту, як на мясцовым, так і на рэгіянальным узроўнях. Спецыяльныя тарыфы павінны дазваляць найбольш бяздольным маладым людзям падарожнічаць.

14. У сельскай мясцовасці мабільнасць і транспарт з'яўляюцца адной з фундаментальных неабходнасцяў для якасці жыцця, а не толькі садзейнічае ўдзелу. Такім чынам, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны падтрымліваць транспартныя ініцыятывы ў сельскай мясцовасці, накіраваныя на прадастаўленне транспартных паслуг (дзяржаўных і прыватных, індывідуальных або калектыўных) і павышэнне мабільнасці ў сельскіх раёнах для такіх груп, як маладыя людзі, якія зараз выключаныя з-за адсутнасці транспартных сродкаў.

## I.4. Палітыка адукацыі і навучання, якая заахвочвае ўдзел моладзі

15. Школа з'яўляецца установай, у якой маладыя людзі не толькі праводзяць значную частку свайго жыцця і праходзяць праграму фармальнага навучання – гэта таксама месца, дзе фармуецца шмат іх думак і поглядаў на жыццё. Важна, каб маладыя людзі даведваліся пра ўдзел і дэмакратыю ў школе і каб былі даступны адпаведныя рэсурсы, курсы па дэмакратыі, удзелу і грамадзянству. Школа павінна быць таксама месцам, дзе

маладыя людзі пазнаюць дэмакратыю ў дзеянні і дзе іхні ўдзел у працэсе прыняцця рашэнняў знаходзіць падтрымку, стымулюецца і ўспрымаецца як эфектыўны. Таму:

i. мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны актыўна стымуляваць удзел моладзі ў школьным жыцці. Ім варта аказваць фінансавую і іншую падтрымку, такую як памяшканне для сустрэч, каб рэалізаваць магчымасць стварэння маладым людзям дэмакратычных аб'яднанняў вучняў. Гэтыя аб'яднанні павінны быць незалежнымі і самакіравальнымі, і калі яны жадаюць гэтага, яны павінны мець права ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў, якія тычацца кіравання школай разам з выкладчыкамі і адміністрацыяй школ;

ii. калі мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады адказваюць за ўтрыманне школьных праграм, ім варта забяспечыць, каб са студэнтамі і студэнцкімі асацыяцыямі праводзіліся кансультацыі на пастаяннай аснове ў дачыненні да навучальных праграм і іх распрацоўкі. Яны таксама павінны гарантаваць, каб грамадзянская і палітычная адукацыя былі ўключаныя да школьнай навучальнай праграмы і атрымлівалі неабходную падтрымку і рэсурсы ў адукацыйных праграмах ўсіх студэнтаў.

## I.5. Палітыка мабільнасці і абменаў

16. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны падтрымліваць аб'яднанні і групы, якія выступаюць за павышэнне мабільнасці моладзі (маладых рабочых, студэнтаў або валанцёраў) пры дапамозе арганізацыі абменаў, і спрыяць фарміраванню сетак і ўсведамлення сябе як грамадзян Еўропы.

17. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны заахвочваць маладых людзей, іх арганізацыі і школы актыўна ўдзельнічаць у міжнародных двухбаковых мерапрыемствах, ўсіх відах абменаў і

еўрапейскіх сетках. Гэтыя органы ўлады павінны быць гатовы аказаць ім фінансавую падтрымку, з тым каб садзейнічаць вывучэнню замежных моў і міжкультурных абменаў, а таксама абмену вопытам.

18. Яны павінны залучаць маладых людзей і/або іх прадстаўнікоў да партнёрскіх камітэтаў і іншых органаў, якія адказваюць за ажыццяўленне такіх абменаў.

## І.6. Палітыка ў галіне аховы здароўя

19. З мэтай садзейнічання з'яўленню і рэалізацыі праектаў, якія распрацоўваюцца маладымі людзьмі і спрыяюць развіццю канцэпцыі ўсебаковага здароўя і дынамікі грамадскага жыцця, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны стварыць або распрацаваць інстытуцыянальны механізм для правядзення кансультацый паміж моладзевымі арганізацыямі, выбарнымі прадстаўнікамі і ўсімі сацыяльнымі і прафесійнымі групамі, звязанымі з пытаннямі сацыяльнага забеспячэння і ўмацавання здароўя.

20. Сутыкнуўшыся з разбуральнай сілай тытуню, злоўжывання алкаголем і наркотыкамі сярод моладзі, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны распрацоўваць і прасоўваць сумесна з прадстаўнікамі моладзевых арганізацый і службамі аховы здароўя мясцовыя асветніцкія праграмы і кансультацыйныя паслугі для маладых людзей, якія пацярпелі ад гэтых праблем, а таксама праводзіць спецыяльную падрыхтоўку сацыяльных работнікаў, валанцёраў і кіраўнікоў арганізацый, якія займаюцца пытаннямі прафілактыкі і рэабілітацыі моладзі.

21. У сувязі з павелічэннем колькасці захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам, мясцовым і рэгіянальным органам улады варта актывізаваць інфармацыйныя кампаніі і

прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на моладзь, такім чынам умацоўваючы ў грамадстве дух салідарнасці, які дазваляе сфармаваць сацыяльныя адносіны, дзе не маюць месца асуджэнне і сегрэгацыя. Маладыя людзі і прадстаўнікі мясцовых моладзевых арганізацый і службаў аховы здароўя павінны актыўна ўдзельнічаць у распрацоўцы і правядзенні гэтых інфармацыйных праграм і практычных мерапрыемстваў.

## I.7. Палітыка гендэрнай роўнасці

22. У рамках палітыкі, накіраванай на стварэнне аптымальных умоў для роўнага ўдзелу жанчын і мужчын у мясцовых і рэгіянальных справах, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны прымаць рашучыя меры ў падтрымку доступу маладых мужчын і жанчын да адказных пасад у прафесійнаму жыцці, асацыяцыях, палітыцы і мясцовых і рэгіянальных органах улады.

23. У рамках сваіх паўнамоцтваў мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны садзейнічаць з ранняга дзіцячага ўзросту адукацыйнай палітыцы роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі.

24. Праводзячы палітыку роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі, мясцовым і рэгіянальным уладам варта:

i. скласці сярэднетэрміновы план з мэтай ліквідацыі няроўнасці паміж маладымі мужчынамі і маладымі жанчынамі;

ii. рэалізаваць і ацаніць меры, накіраваныя на стварэнне роўных магчымасцяў для дзяўчат і маладых жанчын.

25. Для дасягнення такой мэты гэтыя меры павінны даваць дзяўчатам і маладым жанчынам магчымасць:

i. атрымліваць канкрэтную інфармацыю аб навучальных курсах, якія дазваляюць атрымаць прафесійную кваліфікацыю;

ii. аваладаць прафесійнымі навыкамі, прапануючы стыпендыі і спецыяльныя навучальныя курсы па прафесіях, у тым ліку тых, якія традыцыйна лічацца мужчынскімі;

iii. навучаць іх кіраванню дзяржаўнымі справамі, падаўшы ім абавязкі на высокім узроўні на аснове кватавання для жанчын;

iv. прымаць меры па фінансаванню сацыяльных службаў, якія аказваюць дапамогу дзяўчатам і маладым жанчынам.

## I.8. Канкрэтная палітыка для сельскай мясцовасці

26. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны прымаць пад увагу розныя патрэбы моладзі ў сельскай мясцовасці пры распрацоўцы і арганізацыі мерапрыемстваў, накіраваных на прыцягненне моладзі. Такім чынам, яны павінны:

i. забяспечыць, каб палітыка ў галіне адукацыі, занятасці, жылля, транспарту і іншых сферах адлюстроўвала і ўлічвала асаблівыя патрэбы маладых людзей, якія жывуць у сельскай мясцовасці. Гэтая палітыка павінна дапамагчы маладым людзям, якія хочуць жыць у сельскай мясцовасці, не адмаўляцца ад гэтага. Маладыя людзі, якія жывуць у сельскай мясцовасці, не павінны адчуваць пазбаўленняў або сутыкацца з узроўнем сацыяльных паслуг і забеспячэння ніжэй, чым у гарадскіх раёнах;

ii. аказваць фінансавую і іншую падтрымку моладзевым і іншым грамадскім арганізацыям у сельскай мясцовасці. Гэтыя арганізацыі могуць стымуляваць грамадскае і культурнае жыццё ў сельскіх супольнасцях і могуць быць цікавымі цэнтрамі грамадскага жыцця для маладых людзей. Моладзевыя і іншыя грамадскія арганізацыі не толькі граюць важную ролю ў стымуляванні ўдзелу моладзі – яны могуць таксама павысіць якасць жыцця і

вырашыць праблемы, звязаныя, напрыклад, з сельскай ізаляцыяй.

## I.9. Палітыка доступу да культуры

27. Мастацтва і культура існуюць ў формах, якія з'яўляюцца разнастайнымі і пастаянна мяняюцца, у залежнасці ад густаў, месца і часу. Тым не менш, яны належаць дв мінулай, сённяшняй і будучай індывідуальнай і калектыўнай спадчыны, да якой наступныя пакаленні ўносяць свой уклад. Яна, у пэўным сэнсе, з'яўляецца адлюстраваннем кожнага грамадства. Маладыя людзі праз сваю культуру і здольнасць да ініцыятывы, даследаванні і інавацыі, будуюць і граюць важную ролю ў гэтых культурных падзеях. Таму важна даць ім доступ да культуры ва ўсіх яе формах і пашыраць магчымасці для творчай дзейнасці, у тым ліку ў новых напрамках.

28. Таму мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны прыняць, разам з маладымі людзьмі і іх арганізацыямі, палітыку, накіраваную на тое, каб дазволіць ім стаць дзеячамі культуры, падаўшы іх доступ да ведаў, культуры і творчай дзейнасці ў месцах і спосабамі, прызначанымі для гэтай мэты.

## I.10. Палітыка ўстойлівага развіцця і аховы навакольнага асяроддзя

29. Сутыкнуўшыся з відавочным пагаршэннем стану навакольнага асяроддзя, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны аказаць фінансавую падтрымку адукацыйным праектам у школах і грамадскіх аб'яднаннях з мэтай павышэння ўзроўню інфармаванасці аб праблемах навакольнага асяроддзя.

30. Усведамленне таго, што экалагічныя праблемы маюць першараднае значэнне для маладых людзей, якія будуць абавязаны ў будучыні спраўляцца з наступствамі мінулых памылак, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны

падтрымліваць мерапрыемствы і праекты, якія спрыяюць ўстойліваму развіццю і ахове навакольнага асяроддзя, прыцягваючы маладых людзей і іх арганізацыі.

## 1.11. Палітыка барацьбы з гвалтам і злачыннасцю

31. Прымаючы пад увагу, што ахвярамі злачыннасці і гвалту часта з'яўляюцца маладыя людзі і прызнаючы неабходнасць пошуку адэкватных адказаў на праблемы злачыннасці і гвалту ў сучасным грамадстве, а таксама неабходнасць непасрэднага ўключэння моладзі ў барацьбу з гэтымі праблемамі.

32. мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны:

i. прыцягваць маладых людзей да саветаў па прафілактыцы злачыннасці, калі яны існуюць;

ii. працаваць з маладымі людзьмі, якія могуць прымаць удзел у злачынстве ці ўжо былі ўцягнутыя ў злачынства;

iii. змагацца з гвалтам на расавай глебе усімі сродкамі;

iv. спыняць усе формы гвалту ў школах. Гэта павінна быць зроблена ў супрацоўніцтве з усімі адпаведнымі суб'ектамі, такімі як органы адукацыі і паліцыя, выкладчыкі, бацькі і самі маладыя людзі;

v. спрыяць стварэнню сетак грамадскіх аб'яднанняў і праектаў, якія спрыяюць барацьбе з гвалтам і выхаванню талерантнасці як у школе, так і па-за ёй;

vi. рабіць усё магчымае, каб абараніць маладых людзей ад сэксуальнай эксплуатацыі, жорсткага абыходжання або іншых формаў дрэннага абыходжання, а таксама стварыць структуры для аказання псіхалагічнай і матэрыяльнай дапамогі і канфідэнцыйнага кансультавання ахвяр.

33. Пры ажыццяўленні вышэйзгаданага мясцовым і рэгіянальным органам улады варта садзейнічаць усталяванню атмасферы даверы і павагі паміж моладдзю і органамі дзяржаўнай улады, такімі як паліцыя.

## I.12. Палітыка па барацьбе з дыскрымінацыяй

34. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны актыўна адстойваць правы чалавека і меры па барацьбе з дыскрымінацыяй меншасцяў (уключаючы маладых прадстаўнікоў меншасцяў), маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі і іншых груп насельніцтва, якія могуць паддавацца дыскрымінацыі, і павінны спрыяць развіццю мультыкультурных супольнасцяў шляхам інтэграцыі меншасцяў з улікам іх розных патрэбаў, звычаяў, культуры і ладу жыцця.

35. У сувязі з гэтым мясцовым і рэгіянальным органам улады варта:

i. прыняць або ўзмацніць заканадаўства па барацьбе з дыскрымінацыяй, каб забяспечыць роўны доступ для ўсіх грамадзян да грамадскіх месцаў, да прафесійнага навучання, школ, жылля, культурнай дзейнасці і іншых сфер жыцця. Такі доступ павінен адсочвацца і гарантавацца сумеснымі структурамі прадстаўнікоў мясцовых органаў улады і прадстаўнікоў меншасцяў і самой моладзі;

ii. спрыяць міжрэлігійнаму дыялогу, полікультурнай антырасісцкай адукацыі і асвеце па пытаннях процідзеяння дыскрымінацыі ў рамках школьнай праграмы.

## I.13. Палітыка адносна сэксуальнасці

36. У перыяд пераходу ад залежнасці ў дзяцінстве ад сям'і, школы, рэлігійнай абшчыны і іншых «аўтарытэтаў» да самастойнага дарослага жыцця маладыя людзі могуць сутыкнуцца з рознымі пытаннямі, якія тычацца іх асабістых адносінаў (у сям'і ці вузкім коле, са сваімі аднагодкамі, з іх сябрам або партнёрам). Узнікненне і рэалізацыя іх сэксуальных патрэбаў не заўсёды праходзіць лёгка, нават калі яны не гатовыя прызнаць гэта. Акрамя таго, назіраецца невуцтва ў дачыненні да пытанняў сэксуальнага здароўя і недавер да афіцыйнага стаўлення да рызыкаў, звязаных з некаторымі формамі сэксуальнаых паводзінаў.

37. Для таго, каб дапамагчы маладым людзям знайсці свой шлях у гэтай галіне да здаровага і паўнавартаснага эмацыйнага жыцця, мясцовым і рэгіянальным органам улады,

разам з бацькамі, школамі і арганізацыямі, якія працуюць у гэтай галіне, варта развіваць і падтрымліваць:

i. недырэктыўнае палавое выхаванне ў школах;

ii. арганізацыі і службы, якія прадстаўляюць інфармацыю пра ўзаемаадносіны, формы палавога жыцця і планаванне сям'і;

iii. працу з групамі ў гэтай галіне.

38. Маладых людзей варта актыўна прыцягваць да планавання, рэалізацыі і ацэнкі інфармацыі і іншых паслуг, накіраваных на моладзь у гэтай галіне.

## I.14. Палітыка доступу да правоў і права

39. Для таго каб людзы маглі жыць разам, грамадства грунтуюцца на правілах, якія павінны выконвацца ўсімі. У дэмакратычных грамадствах гэтыя правілы абмяркоўваюцца і зацвярджаюцца выбарнымі прадстаўнікамі грамадзян і атрымліваюць канкрэтнае выражэнне, напрыклад, у заканадаўчых тэкстах, у якіх вызначаюцца правы і абавязкі ўсіх людзей.

40. З павелічэннем колькасці гэтых тэкстаў для чалавека становіцца ўсё цяжэй і цяжэй ведаць, захоўваць і ўжываць іх, што стварае няроўнасць паміж грамадзянамі. Маладыя людзі, натуральна, занепакоеныя гэтым становішчам.

41. У сувязі з гэтым мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны садзейнічаць доступу моладзі да сваіх правоў:

i. пашыраючы іх веды пры дапамозе распаўсюджвання інфармацыі, менавіта ў школах, групах аднагодкаў і інфармацыйных сервісах;

ii. шляхам прымянення сваіх правоў праз падтрымку службаў, прызначаных для працы разам з маладымі людзьмі, якія хочуць гэтага;

iii. дазваляючы маладым людзям удзельнічаць у складанні новых правілаў.

# Частка II. Сродкі для ўдзелу моладзі

42. Для дасягнення рэальнага ўдзелу моладзі, у распараджэнне моладзі павінен быць прадастаўлены пэўны набор інструментаў. Гэта цягне за сабой развіваючае навучанне ўдзелу маладых людзей, трыманне іх у курсе, прадастаўленне сродкаў сувязі, падтрымку маладзёжных праектаў і прызнанне прадастаўлення больш высокага профілю гатоўнасці маладых людзей

прысвяціць сябе служэнню грамадству і бязвыплатнай працы. Удзел адбываецца толькі з поўнай самааддачай, калі прызнаецца роля моладзі ў палітычных партыях, прафсаюзах і грамадскіх аб'яднаннях і, перш за ўсё, калі існуюць намаганні, каб спрыяць фармаванню моладзевых аб'яднанняў з удзелам і сіламі саміх маладых людзей.

## II.1. Навучанне моладзі прыманню ўдзелу

43. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады, якія ўсведамляюць дамінуючую ролю, якую граюць школы ў жыцці маладых людзей, павінны забяспечыць у школьным асяроддзі падтрымку і падрыхтоўку моладзі да ўдзелу, выхавання ў галіне правоў чалавека і нефармальнага навучання ў школах. Яны таксама павінны забяспечыць навучанне і падтрымку ўдзелу моладзі ў грамадскіх аб'яднаннях і ў жыцці мясцовых суполак праз:

i. прафесійнае навучанне для настаўнікаў і моладзевых работнікаў у практыцы ўдзелу моладзі;

ii. усе формы удзелу вучняў у жыцці школы;

iii. праграмы грамадзянскай адукацыі ў школах;

iv. навучанне груп аднагодкаў, падаючы памяшканні і сродкі, а таксама падтрымку абмену станоўчым вопытам.

## II.2. Інфармаванне моладзі

44. Часта інфармацыя з'яўляецца ключом да ўдзелу, а права моладзі на доступ да інфармацыі аб магчымасцях і пытаннях, якія тычацца іх, яшчэ больш прызнаецца ў афіцыйных еўрапейскіх і міжнародных дакументах, і не толькі ў кантэксце мясцовага і рэгіянальнага жыцця.

45. Для таго, каб удзельнічаць у мерапрыемствах і ў жыцці сваёй супольнасці або карыстацца паслугамі і магчымасцямі, накіраванымі на іх, маладыя людзі павінны ведаць пра іх. Удзел у мерапрыемствах і праектах, якія цікавяць іх і якія яны самі арганізуюць, часта з'яўляюцца крокам у працэсе іх заахвочвання да больш актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства, у тым ліку палітычнага жыцця.

46. Таму мясцовым і рэгіянальным органам улады варта падтрымліваць і ўдасканальваць існуючыя інфармацыйныя і кансультацыйныя цэнтры для маладых людзей з тым, каб гарантаваць, што яны прадастаўляюць якасныя паслугі, якія адказваюць патрэбам маладых людзей. У месцах, дзе такія цэнтры адсутнічаюць, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады і іншыя адпаведныя суб'екты павінны заахвочваць і дапамагаць стварэнню адэкватных інфармацыйных службаў для моладзі, менавіта, з дапамогай існуючых структур, такіх як школы, моладзевыя службы і бібліятэкі. Канкрэтныя меры павінны быць прынятыя для задавальнення інфармацыйных патрэбаў тых маладых людзей, якія маюць цяжкасці ў доступе да інфармацыі (моўныя бар'еры, адсутнасць доступу да Інтэрнэту і г.д.).

47. Інфармацыйныя паслугі для моладзі павінны адпавядаць пэўным прафесійным прынцыпам і стандартам[1]. Органам дзяржаўнай улады варта забяспечыць захаванне такіх стандартаў і іх пастаяннае ўдасканаленне, дзе гэта магчыма, у адпаведнасці з наборам ўзгодненых на нацыянальным (або рэгіянальным) узроўні параметраў і стандартаў якасці. Маладыя людзі павінны мець магчымасць удзельнічаць у падрыхтоўцы, рэалізацыі і ацэнцы мерапрыемстваў і

[1] Гл., напрыклад, Еўрапейскую маладзёжную інфармацыйную хартыю, прынятую Еўрапейскім агенцтвам па інфармацыі моладзі і кансультаванню (ERYICA).

інфармацыйных прадуктаў моладзевых інфармацыйных цэнтраў/службаў, і быць прадстаўленымі ў іх кіруючых органах.

## II.3. Садзейнічанне ўдзелу моладзі пры дапамозе інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій

48. Інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі могуць адкрыць новыя магчымасці для інфармавання і ўдзелу маладых людзей. Яны могуць быць выкарыстаныя для абмену самай разнастайнай інфармацыяй, і дзякуючы іх інтэрактыўнаму характару - для пашырэння ўдзелу маладых людзей. Таму мясцовым і рэгіянальным органам улады варта выкарыстоўваць гэтыя тэхналогіі ў сваёй інфармацыйнай палітыцы і палітыцы ўдзелу, пры ўмове, што доступ да іх будзе гарантаваны для ўсіх маладых людзей з пункту гледжання месцаў доступу і азнаямлення з гэтымі новымі інструментамі.

## II.4. Садзейнічанне ўдзелу моладзі ў сродках масавай інфармацыі

49. Маладыя людзі з'яўляюцца асноўнымі спажыўцамі прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі; яны таксама могуць быць дзеючымі асобамі ў гэтай галіне, пашыраючы такім чынам магчымасці, якія ім надаюцца, каб выказаць сябе і прыняць удзел у падрыхтоўцы інфармацыі, якая публікуецца сродкамі масавай інфармацыі. Дзякуючы іх падыходу да некаторых пытанняў, яны дазваляюць надаваць розную і часта больш даступную інфармацыю сваім аднагодкам. Такі ўдзел таксама дазваляе маладым людзям зразумець, як будуецца інфармацыйная праца, і атрымаць неабходнае крытычнае мысленне.

50. У сувязі з гэтым мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны падтрымліваць стварэнне і функцыянаванне сродкаў

масавай інфармацыі (радыё, тэлебачанне, друкаваная і электронная прэса і г.д.), якія былі распрацаваныя маладымі людзьмі для маладых людзей, а таксама адпаведных навучальных праграм.

## II.5. Заахвочванне маладых людзей да правядзення добраахвотнай працы і прысвячэння сябе службе грамадству

51. Маладыя людзі павінны атрымліваць падтрымку і заахвочвацца да ўдзелу ў валанцёрскай дзейнасці. У той час, калі маладыя людзі знаходзяцца пад ціскам дасягнення поспехаў у вучобе і ў працы, важна спрыяць валанцёрству і прызнаваць яго. Такім чынам, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны:

i. падтрымліваць стварэнне добраахвотных цэнтраў і развіваць ініцыятывы, накіраваныя на падтрымку і прапаганду ўдзелу моладзі ў валанцёрскай дзейнасці, такія як інфармацыйна-рэкламныя кампаніі.

ii. у партнёрстве з моладдзю, грамадскімі арганізацыямі, органамі адукацыі і працадаўцамі распрацаваць сістэмы прызнання бязвыплатнай дзейнасці ў сістэме фармальнай адукацыі і ў сферы занятасці.

## II.6. Падтрымка моладзевых праектаў і ініцыятыў

52. Дзякуючы сваім надзеям і жаданням маладыя людзі маюць мноства ідэй, якія могуць быць трансфармаваныя ў праекты і мерапрыемствы на мясцовым узроўні, якія з'яўляюцца выгаднымі для ўсіх. Пры належнай падтрымцы гэтыя праекты, іх паспяховая рэалізацыя, таксама як і няўдачы, могуць дапамагчы моладзі выхаваць у сабе пачуццё адказнасці і самастойнасці, стаўшы такім чынам сацыяльнымі суб'ектамі. Таму мясцовым і рэгіянальным органам улады варта садзейнічаць рэалізацыі

такіх праектаў, незалежна ад таго, маленькія яны ці буйнамаштабныя, дапамагаючы ім шляхам прыцягнення прафесіяналаў і прадастаўлення доступу да фінансавай і матэрыяльна-тэхнічнай дапамогі.

## II.7. Папулярызацыя моладзевых арганізацый

53. Моладзевыя арганізацыі ўнікальныя тым, што яны ў асноўным факусуюцца на адлюстраванні думак і абслугоўванні патрэбаў і інтарэсаў моладзі. Яны таксама даюць прастору, у якой маладыя людзі могуць спазнаць і выпрабаваць на практыцы магчымасці і выклікі ў прыняцці рашэнняў і дзеянняў з іншымі маладымі людзьмі. Яны могуць быць структураванымі арганізацыямі або нефармальнымі групамі маладых людзей. Важна, каб маладыя людзі мелі магчымасць ўступіць у моладзевую арганізацыю па свайму выбару ў іх суполцы, калі яны таго пажадаюць. Маладыя людзі таксама павінны мець права на падтрымку стварэння сваіх уласных арганізацый, калі яны гэтага захочуць. Таму:

i. мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны мець спецыяльныя бюджэтныя сродкі выключна для падтрымкі моладзевых арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць ці прапануюць паслугі, або выступаюць як голас моладзі ў дадзенай мясцовасці, ці ж адстойваюць моладзь. Перавагу варта аддаваць тым арганізацыям, якімі кіруюць самі маладыя людзі і/або маюць працэдуры і сістэмы, якія дазваляюць забяспечыць актыўны ўдзел моладзі;

ii. мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны распрацаваць прынцып сумеснага кіравання і сістэму прыняцця рашэнняў Савета Еўропы сумесна з моладдзю і моладзевымі арганізацыямі па пытаннях, якія маюць дачыненне да моладзі. Важна, каб там, дзе ўжываюцца такія структуры сумеснага кіравання, моладзь і

моладзевыя арганізацыі карысталіся павагай у якасці паўнапраўных партнёраў, а таксама мелі выбар не ўдзельнічаць, калі яны таго пажадаюць.

## II.8. Удзел моладзі ў няўрадавых арганізацыях (НУА) і палітычных партыях

54. Дынамічны, незалежны і актыўны няўрадавы сектар з'яўляецца найважнейшым элементам любога сапраўды дэмакратычнага грамадства. Важна таксама, каб іншыя сектары грамадзянскай супольнасці, такія як палітычныя партыі, былі моцнымі і актыўнымі на мясцовым і рэгіянальным узроўнях. Удзел у дэмакратычным жыцці любой краіны, рэгіёна або горада не зводзіцца да галасавання кожныя некалькі гадоў. Удзел у дзейнасці няўрадавых арганізацый і палітычных партый так важны, паколькі дапамагае грамадзянам ўплываць на рашэнні і дзеянні на пастаяннай аснове. Таму вельмі важна, каб маладыя людзі атрымлівалі падтрымку і заахвочваліся да ўдзелу ў асацыятыўным жыцці ў сваіх супольнасцях.

55. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны выдзяляць неўрадавым арганізацыям фінансавыя і іншыя рэсурсы, якія актыўна спрыяюць ўдзелу моладзі ў іх дзейнасці, а таксама дэмакратычным структурам і працэдурам прыняцця рашэнняў.

56. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады сумесна з палітычнымі партыямі павінны непрадузята спрыяць прыцягненню моладзі ў партыйную палітычную сістэму ў цэлым і падтрымліваць канкрэтныя дзеянні, такія як навучанне.

# Частка III: Інстытуцыянальны ўдзел моладзі ў мясцовых і рэгіянальных справах

57. У мэтах ажыццяўлення розных галіновых стратэгій, выкладзеных у Частцы I, мясцовым і рэгіянальным органам улады варта ўвесці ў дзеянне адпаведныя структуры або

механізмы, якія дазваляюць забяспечыць удзел моладзі ў прыняцці і абмеркаванні рашэнняў, якія тычацца іх.

58. Гэтыя структуры могуць прымаць розныя формы, у залежнасці ад узроўню, на якім яны ствараюцца, ці то сяло, невялікі горад, прыгарад буйнога горада ці нават рэгіён. Яны павінны стварыць умовы для сапраўднага дыялогу і партнёрства паміж моладдзю і мясцовымі і рэгіянальнымі органамі ўлады, і яны павінны даць магчымасць маладым людзям і іх прадстаўнікам стаць паўнапраўнымі дзеючымі асобамі палітыкі, якая іх датычыцца. Такія структуры звычайна павінны быць прадстаўнічымі і на пастаяннай аснове займацца ўсімі пытаннямі, да якіх маладыя людзі выказваюць цікавасць. Акрамя таго, можа быць прадугледжана, што можа быць створана спецыяльная структура для абмеркавання або дзейнасці на аснове канкрэтнага пытання. У асобных выпадках можа быць мэтазгодна спалучаць розныя формы.

## III.1. Моладзевыя саветы, моладзевыя парламенты, моладзевыя форумы

59. Эфектыўны ўдзел моладзі ў мясцовых і рэгіянальных справах павінны быць заснаваны на разуменні сацыяльных і культурных зменаў, якія адбываюцца ў іх суполцы, і патрабуе пастаяннага прадстаўніка структуры, такі як моладзевы савет, моладзевы парламент або моладзевы форум.

60. Такая структура можа фарміравацца з дапамогай выбараў, прызначэння з арганізацый маладых людзей і/або на добраахвотнай аснове. Яе склад павінен адлюстроўваць сацыяльную структуру грамадства.

61. Маладыя людзі павінны непасрэдна адказваць за праекты і граць актыўную ролю ў рэалізацыі адпаведных стратэгій. Для гэтага, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны стварыць

ці падтрымаць структуры, якія забяспечваюць актыўны ўдзел моладзі.

62. Гэтыя структуры забяспечваюць фізічную аснову для свабоднага выказвання маладымі людзьмі іх праблем, асабліва па давядзенні праблемы да ведама органаў улады, а таксама магчымасць унясення прапаноў да іх. Пытанні, якія будуць узнятыя, могуць адлюстроўваць прадугледжаныя ў Частцы I Хартыі.

63. Ролі такой структуры могуць ўключаць:

i. забеспячэнне форуму для свабоднага выказвання моладдзю сваіх праблем, асабліва якія тычацца прапаноў і палітыкі ўлад;

ii. прадастаўленне магчымасці для маладых людзей сфармуляваць свае прапановы для мясцовых і рэгіянальных органаў улады;

iii. прадастаўленне магчымасці органам улады кансультаваць моладзь па канкрэтных пытаннях;

iv. забеспячэнне форуму, на якім праекты з удзелам маладых людзей распрацоўваюцца, кантралююцца і ацэньваюцца;

v. забеспячэнне форуму для садзейнічання правядзенню кансультацый з асацыяцыямі і моладзевымі арганізацыямі.

vi. садзейнічанне ўдзелу моладзі ў іншых кансультацыйных органах мясцовых і рэгіянальных улад.

64. Падаючы моладзі магчымасць выказвацца і дзейнічаць для вырашэння праблем, якія іх тычацца, структуры такога роду забяспечваюць навучанне прынцыпам дэмакратычнага жыцця і кіраванню грамадскімі справамі.

65. Таму моладзь варта заахвочваць да ўдзелу ў такіх структурах і дзейнасці, што ажыццяўляецца ў іх рамках, з мэтай

садзейнічання іх патэнцыялу вывучэння і практычнай рэалізацыі прынцыпаў дэмакратычнага грамадства. А для тых маладых людзей, якія з'яўляюцца ініцыятарамі праектаў і дыялогу з уладамі, такога роду структуры служаць яшчэ і форумам для навучання асновам дэмакратычнага лідэрства.

66. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады і самі маладыя людзі таксама выйграюць ад эфекту мультыплікатара, які можа вырабіць ўдзел моладзі ў такіх структурах, асабліва ў плане заахвочвання маладых людзей да ажыццяўлення іх грамадзянскіх правоў, такіх як удзел у выбарах і іншых формах выказвання свайго меркавання, уключаючы рэферэндумы.

## III.2. Падтрымка структур, якія забяспечваюць ўдзел моладзі

67. У мэтах эфектыўнага функцыянавання інстытуцыйныя структуры, якія забяспечваюць ўдзел моладзі (як фармальныя, так і нефармальныя), маюць патрэбу ў рэсурсах і падтрымцы. Для гэтага мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны выдзяляць такім структурам памяшкання, фінансавыя сродкі і матэрыяльную падтрымку, неабходныя для мэтаў нармальнага і эфектыўнага функцыянавання. Вылучэнне такіх сродкаў не выключае, што гэтыя структуры могуць атрымліваць дадатковую фінансавую і матэрыяльную падтрымку з іншых крыніц, такіх як прыватныя фонды і кампаніі.

68. Мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады павінны гарантаваць прадастаўленне падтрымкі структурам, якія забяспечваюць ўдзел моладзі. Для гэтага ім варта прызначыць гаранта – асобу або групу асоб, якая адсочвала бы прадастаўленне падтрымкі і да якіх гэтыя структуры маглі б самі звярнуцца ў выпадку неабходнасці.

69. Такая асоба або група асоб павінна быць незалежнай ад палітычных структур і структур, якія забяспечваюць ўдзел моладзі, а прызначэнне павінна ўзгадняцца сумесна абедзвюма структурамі.

70. У дадатак да забеспячэння вышэйзгаданай падтрымкі функцыі гэтай асобы (асоб) могуць уключаць:

i. выступаць у якасці пасярэдніка паміж моладдзю і выбранымі мясцовымі і рэгіянальнымі прадстаўнікамі па пытанні, паднятым тым ці іншым бокам;

ii. выступаць у якасці адваката маладых людзей у адносінах з мясцовымі і рэгіянальнымі органамі ўлады ў напружаных сітуацыях паміж імі;

iii. выступаць у якасці канала, праз які мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады могуць мець зносіны з маладымі людзьмі;

iv. рэгулярна падрыхтоўваць даклады для маладых людзей і мясцовых і рэгіянальных органаў улады з мэтай ацэнкі ўзроўню ўдзелу моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях, напрыклад, шляхам рэалізацыі праектаў або ўдзелу ў моладзевых структурах, а таксама ўплыву іх удзелу.

Маладыя людзі павінны ўдзельнічаць у дэмакратычных структурах і працэсах, выказваць свае думкі і прымаць рашэнні, якія ўплываюць на іх жыццё. Іх удзел з'яўляецца неабходным, калі мы хочам пабудаваць больш дэмакратычныя і развітыя грамадствы.

Кангрэс мясцовых і рэгіянальных прадстаўнікоў улады Савета Еўропы перакананы, што менавіта на мясцовым і рэгіянальным узроўнях ўдзел моладзі можа эфектыўна ўкараніцца і развівацца. Яшчэ ў 1992 г. Кангрэс ініцыяваў стварэнне Еўрапейскай хартыі ўдзелу моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці, перагледжанай у 2003 г. з мэтай лепшага адлюстравання змяненняў у грамадстве.

Перагледжаная Хартыя змяшчае прынцыпы, лепшыя практыкі і рэкамендацыі, якія спрыяюць павелічэнню ўдзелу моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях. У ёй таксама выкладзены асноўныя патрабаванні для таго, каб гэты ўдзел быў эфектыўным, маладыя людзі павінны мець неабходныя правы, сродкі, прастору, магчымасці і падтрымку. Гэтая Хартыя не з'яўляецца дакументам, які мае юрыдычную сілу, аднак краіны-сябры маюць маральны абавязак рэалізоўваць яе.

Prems 035015

BEL

www.coe.int

Савет Еўропы з'яўляецца вядучай арганізацыяй на кантыненце ў галіне абароны правоў чалавека. У яе склад уваходзяць 47 краін-сяброў, 28 з якіх з'яўляюцца членамі Еўрапейскага Саюза. Кангрэс мясцовых і рэгіянальных органаў улады – гэта структурны орган Савета Еўропы, якая адказвае за ўзмацненне мясцовай і рэгіянальнай дэмакратыі ў 47 краінах-членах. Кангрэс, які складаецца з дзвюх палат – Палаты мясцовых уладаў і Палаты рэгіёнаў – і трох камітэтаў, аб'ядноўвае 648 выбарных службовых асоб, якія прадстаўляюць больш за 200 000 мясцовых і рэгіянальных органаў улады.